Самапомач

Беларуская Коопэратыўна-Гаспадарчая Часопiсь


Год III. | Вільня, Травень 1934 г. | № 5.

Хай злыдні над намі,
скрыгочуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!..
ЯНКА КУПАЛА.



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапомачу.

Джордж РЭСС ЭЛЬ (Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ № 4(21).

Ceny ŭ Vilni.

23 V.34 г.

CENY. Zbožža za 100 kilo:

Žyta, II	12.85 zł.
Pšaničnaja muka, 4/0.	30.——32.50 zł.
Žytniaja muka 65 prac.	18.—18.50 zł.
Žytniaja muka, 55 prac.	22.25—22.50 zł.
Žytniaja muka sitkowaja	17. zł.
Žytniaja muka razowaja	16.50 zł.

Miasny rynak, 15.V.34. za 1 kilo:

Vałowina, cełyja štuki, II i III hat	—85—95 hr.
Vałowina, zady, I i II hat.	1.10—1.25 zł.
Vałowina, pierady, (košer) I i II hat.	1.—1.50 zł.
Cialacina, II i III hat.	70—80 hr.
Švinina, I hat.	1.15—1.20 zł.
Švinina, II i III hat.	1.05—1.15 zł.

Małako, jajki, 18.V.34.

Ličby ŭ dužkach aznačajuć cenyŭ detalu (u drabnicy):

Masła najlepšaje za kilo.	2.60(3.00) zł.
„ stałowaje	2.40(2.80) „
Syry nawahradzkija	2.20(2.60) „
„ litoŭskija	1.70(2.00) „
Jajki za kapu	3.00—3.90 „
„ za štuku	6—8 hr.

Skury syryja:

Bydlačyja, za 1 kilo	95 hr.
Cialačyja, za štuku	4 zł.

Hrošy, 18.V.34.

Lit litoŭski	0.88—0.89
Łat łatvijski	1.37 - 1.40
Čyrvoniec saviecki	1.20
Rubiel zołatam, u 5-rubloŭcy	4.61
„ „ u 10-rubloŭcy	4.65

„Самапомач"

Часопісь выходзіць раз у месяц.

Падпісная плата аднаго экзэмпляра каштуе:

На год	3.— зл.
На паўгода	1.75 „
На 3 месяцы	1.20 „

Заграніцу — ўдвая даражэй.

Цана асобнага нумару 40 грашоў.

Цана абвестак паводле ўмовы.

Коопэратывы, гурткі і прыватныя асобы, што выпісваюць на адзін адрэс найменш 10 экзэмпляраў „Самапомачы" (камплект), плацяць за экзэмпляр толькі 1.20 зл. за 10 экз. 12 зл.

Грошы на «Самапомач» пасылаць на чэкавае конто інж. Клімовіча у П.К.О. Nr. 180 485, а ўсякія пісьмы — на адрэс:

Redakcyja „Samapomač", Vilnia, Połackaja vul. 4 10
(Wilno, Połocka 4—10).

Рэдакцыя адчынена ў аўторкі і пятніцы ад 9-ай да 11-ай гадз. дня.

Samapomač

BIEŁARUSKAJA
KOOPERATYŬNA-HASPADARČAJA
ČASOPIŚ.

Adres:
VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

Самапомач

Hod III.	Vilnia, Travień 1934 h.	Nr. 5 (22).

ЗА ЧЫЙ ГРЭХ — ЗА ЧЫЮ ВІНУ?

(*Замест «На дзень коопэрацыі»*).

Translated from Polish and White-Russ.

FOR WHOSE SIN — FOR WHOSE FAULT?

(*Instead of „On the day of cooperation"*).

Odpis.

URZĄD WOJEWÓDZKI Nowogródzki Wydział Bezpieczeństwa — *Nowogródek, dn. 21 lutego 1934 r.*

L. BP. 214/I.
Przedmiot:

DECYZJA.

Orzeczeniem z dnia 25/I—34 r. L. BP. 345/8 Starosta powiatowy w Nowogródku działając na mocy art. 72 i 75 rozporządzenia Prezydenta R. P. z dnia 22/III—1928 r. o postępowaniu administracyjnem (Dz. U. R. P. Nr. 36 z roku 1928) oraz art. 9 ustawy o zgromadzeniach z dnia 11 marca 1932 r. (Dz. U. R. P. Nr. 48 z roku 1932), nie przyjął do wiadomości zawiadomienia założycieli spółdzielni w Niehniewiczach z dnia 18/I—1934 r. i z uwagi na spokój i porządek publiczny zakazał urządzenia przez Romana Lecko zgromadzenia w Niehniewiczach w sprawie zorganizowania spółdzielni białoruskiej. —

Po rozpatrzeniu akt sprawy oraz odwołania Romana Lecko z dnia 8/II—rb. wniesionego w terminie przepisanym — na zasadzie art. 93 rozporz. Prezydenta R. P. z dnia 22/II—28 r. o postępowaniu administracyjnem (Dz. U. R. P. Nr. 36 poz. 341) Urząd Wojewódzki Nowogródzki

p o s t a n a w i a:

odwołanie Romana Lecko z dnia 8.II. rb. odrzucić, a zaskarżoną decyzję Starosty powiatowego w Nowogródku z dnia 25/I—34 r. Nr. BP. 345/8 zatwierdzić jako uzasadnioną z motywów podanych w cytowanem orzeczeniu. —

Decyzja niniejsza jest ostateczna w administracyjnym toku instancji, co nie wyklucza ewentualnego uprawnienia do wniesienia skar-

Copy.

WAYWODE-OFFICE of Nowogródek Security Department. — *Nowogrodek, February 21, 1934.*

Nr. 214/I. Publ. Secur.
Subject:

DECISION.

The decision on the 25th day of January 1934, Secur. Dept. Nr. 345/8, the Starost of the District of Nowogródek acting on the power of Art. 72 and 75 of arrangement of President of the Republic of Poland on the 22nd day of March 1928 of the procedure of administration (Official Journal of the Republic of Poland, Nr. 36, year 1928) and Art. 9 law concerning meetings on the day of the 11th of March 1932, (Off. Journ. of the Rep. of Poland, Nr. 48, year 1932), — did not take note of the information from the founders of the cooperative Company at Niehniewicze on the day 18th of Jan. 1934, and with regard to the quiet and public order prohibited the holding of the meeting by Roman Lecko at Niehniewicze for the purpose of organization of White Russian cooperative-company.

After considering the act of the process and the repeal of Roman Lecko on the 8th day of Febr. 1934, forwarded at the prescribed term, on the ground of Art. 93 of the arrangem. of the Presid. of the Rep. of Poland from 22.II.28 of the procedure of administration (Offic. Journ. of Rep. of Poland, Nr. 36, pos. 341), — the Waywode Office at Nowogródek

r e s o l v e s:

to reject the repeal of Roman Lecko on the 8.II.1934, but the rejects of the decision of Starost of Nowogródek Distr. on 25.I.34, Nr. 345 Publ. Sec. — to confirm as based on the motives given in the quoted decision.

The present decision is the final one in the Administration of the last resort, but does

gi do Najwyższego Trybunału Administracyjnego. —

Za Wojewodę
(—) *M. Jasiński* (M. Jasiński).
Naczelnik Wydziału.

Ja, Józef Wierzyński, Tłumacz Przysięgły przy Sądzie Okręgowym w Wilnie zaświadczam zgodność odpisu i tłumaczenia powyższego z oryginałem przedstawionym mi przez p. Inż. Adolfa Klimowicza zamieszkał. w/m. ul. Połocka 4 m. 10. — Wilno, dnia 24 maja 1934 r. (—) J. Wierzyński.

not exclude possible rights to carry the complaint to the Highest Court of Administration.

Instead of Waywode
(—) *M. Jasiński*
Chief of the Depart.

I, Józef Wierzyński, the Sworn Translator by the Circuit-Court at Wilno, atteste the conformity of the translation above to the original, presented to me by Ing. Adolf Klimowicz, residing at Wilno, Połocka-Street 4 10. Wilno, the 24 May 1934 (—) J. Wierzyński.

SIGILLUM.

† Мікола ВЯРШЫНІН

доўгалетні сэніор беларускай калёніі ў Празе Чэскай, дыплёматычны прадстаўнік Ураду БНР пры Урадзе чэскім, доўгалетні бяззьменны старшыня „Беларускай Грамады ў Празе“, „Беларускай Рады ў Празе“, функцыянар „Беларускага Нацыянальнага Камітэту заграніцай“, кіраўнік „Беларускага Заграністага Архіву ў Празе“, ахвярны і адзыўчывы апякун беларускага студэнства, супрацоўнік „Самапомачы“, няўтомны барацьбіт за волю беларускага Народу, а прадусім чалавек рэдкай шчырасьці і дабраты —

памёр на 8-ым дзесятку свайго працавітага і цяжкога жыцьця дня 6-га траўня 1934 г. Пахаваны на Альшанскіх могілках у Празе дня 9-га траўня 1934 г.

ЗЯМЕЛЬКА БРАТНЯЯ! БУДЗЬ ЛЁГКАЙ ВЕРНАМУ СЫНУ БЕЛАРУСІ!

„Mahazyny“ varočajucca?

Ludzi starejšyja dobra pamiatajuć, jak na našych ziemlach isnavali i pracavali „mahazyny“, inakš viedamyja jšče jak „ssypki“. Da siahońnia ŭ šmat miascoch stajać jašče hetyja budynki, choć słužać užo inšaj spravie. Viedama naprykład, što ŭ paru miascoch takija „mahazyny“ stali słužyć jak biełaruskija „Narodnyja Damy“ ci navat „Narodnyja Universytety“. Adnym słovam „mahazyny“ na Biełarusi majuć svaju historyju, svaju minuŭščvnu. Apošnija viestki adnak nakazvajuć, što hetyja „mahazyny“ buduć mo' mieć u nas jašče i svaju budučyniu Sprava pradstaŭlajecca hetak:

Kožny sielanin viedaje, jak kryŭdnym dla jaho źjaŭlajecca siahońniašniaje pałažeńnie na rynku: usio što patrabuje kupić — doraha, a što maje pradać — idzie za biascen. Doŭha łamali ludzi nad hetym hałovy i radzili ŭsialakija sposaby pomačy. Było ich šmat, dobravolnych — da peŭnaj miery — i prymusovych. Ab hetych apošnich my anahdaj koratka ŭspomnili: byŭ

D-r Fr. Stefčyk.

(U 10-ja ŭhodki śmierci Vialikaha Budaŭničaha polskaj ziemlarobskaj kooperacyi).

Sioleta 30 červienia minaje 10 hadoŭ ad dnia śmierci D-ra Fr. Stefčyka, zakładčyka i doŭhaletniaha kiraŭnika polskaj ziemlarobskaj kooperacyi, spačatku ŭ Haliččynie, a paśla i ŭ Polščy paślavajennaj. Imia vialikaha narodalubca siahońnia viedama i nie ŭ adnym kucie Zach. Biełarusi. Nažal, padavałasia jano nam i padajecca najčaściej u niasmačnym nacyjanalna-čužym sosie, ad čaho sama sapraŭdnaj pašany hodnaja postać Fr. Stefčyka vielmi ciarpieła i cierpić na vyraznaści i praŭdzivaści. Pryhledźmosia dziela hetaha da asoby Stefčyka biespasiaredna.

Radziŭsia Fr. Stefčyk u Krakavie, u 1861 h. Navuki ŭsie zdabyvaŭ u tym-ža Krakavie, kančajučy tamašni universytet z dyplomam dochtara filozofii. Mieŭ tady ŭsiaho 23 viasny svajho žyćcia. Pytańniami hramadzkimi cikaviŭsia Fr. Stefčyk jašče na himnazijalnaj łaŭcy, uračysta prysiahajučy ŭ kaściele, što budzie słužyć tolki spravie adradžeńnia svaje baćkaŭščyny. I hetaj spravie słužyŭ z usich sił da samaj svajoj śmierci 30-ha červienia 1924 hodu, zdabyvajučy pryznańnie dla siabie jak siarod svaich adnaplamiencaŭ, tak i siarod čužyncoŭ.

Čym-ža tak Fr. Stefčyk zasłužyŭsia?

Moža literaturaj, moža historyjaj, — jakimi Jon hetak cikaviŭsia ŭ škole jašče jak vučań i vučycielam jakich staŭsia paśla ŭ pravincyjalnaj siaredniaj haspadarčaj škole? — Nie... I historyja i literatura byli dla Stefčyka tolki pamocnymi viedami da paznańnia, što „adradžeńnie i budučynia Narodu lažyć u narodnaj masie, u jaje padniaćci i ŭśviedamleńni“. Hetak razumiejučy spravu, Fr. Stefčyk jašče na himnazijalnaj łaŭcy, z vučnioŭskich składak arhanizavaŭ padpisku i razdavańnie siarod sialan rodnaj knižki i hazety. A kali končyŭ navuki vyšejšyja, nie staraŭsia — choć moh — ciopłych i vyhodnych pasadaŭ u rodnym sabie Krakavie ci inšym vialikim horadzie, ale ŭsiej siłaj imknuŭsia na viosku, kab jaje z-blizka paznać i kab šukać dla jaje po-

heta złožany ŭ polskim Sojmie prajekt pasła Rudzinskaha. Prajekt hety adnak zdajecca i astaniecca tolki prajektam. Zatoje daloka pavažniej vyhladaje rada inšaja, padadzienaja ŭ № 4 polskaha kooper. žurnału „Spółdzielczy Przegląd Naukowy". Istota hetaj rady bolšmienš nastupnaja:

U hminach majuć być sarhanizavany mahazyny, jakija mahli-b pamiaścić da 4 vahonaŭ zbožža kožny. Haspadarom i ŭłaśnikam hetych mahazynaŭ byli-b hminy. Košt budovy novaha mahazynu abličany na 4.000 (čatyry tysiačy) zł. Dzie takija mahazyny ŭžo jość — tym lepš. U kožnym mahazynie pavinna być vaha i mašyny da čyščeńnia zbožža.

U pavietavym mieście budzie na siabroŭskich pajoch sarhanizavana pavietavaja ziemlarobska handlovaja kooperatyva. Jana kiruje pracaj hminnych mahazynaŭ, handlujučy adnačasna aproč taho nasieńniem, štučnymi hnajami, ziemlarobskimi mašynami.

Usie pavietavyja ziemlarobska-haspadarčyja kooperatyvy złučany buduć u Centralu ziemlarobska-handlovych kooperatyvaŭ. Pavietavaja kooperatyva kuplacimie zbožža z mahazynaŭ i ad pryvatnych svaich siabroŭ tolki na kamisovy rachunak svajej centrali, pa canie zaležnaj ad jakaści zbožža i na halandzkuju vahu. Sialanin, addajučy ŭ mahazyn zbožža, atrymaje kvit pavietavaj kooperatyvy, za jaki ŭsie hrošy (ale peŭnaž što nia zrazu) vypłačvaje jamu najbližejšaja kredytovaja kooperatyva. Za takoje pasiarednictva i za ačystku zbožža kooper. mašynami ŭ hminnych mahazynach zatrymoŭvajecca na karyść kooperatyvy: ad siabroŭ — 3 prac., a ad niesiabroŭ — 4 prac. vartaści pradadzienaha zbožža.

Sama centrala ziemlarobska-handlovych kooperatyvaŭ urešcie taksama ničym nia ryzykuje, bo skuplaje zbožža pa daručeńniu dziaržaŭnaj pramysłova-zbažžovaj ustanovy (PZPZ), jakaja pavinna była-b zachavać za saboj manapol tolki na eksport zbožža; usiu handlovuju palityku na ŭnutranym rynku PZPZ pavinien pieradać vieści Centrali pavietavych ziemlarobska-handlovych kooperatyvaŭ.

Hetak u haloŭnych rysach pradstaŭlajecca prajekt arhanizacyi zbytu ziemlarobskich praduktaŭ. Ci hetamu prajektu sudžana zbycca — nichto jašče nia viedaje. U kožnym razie padychod da spravy ŭ hetym prajekcie davoli račovy. Adna biada tolki, što jon zusim nia ličycca z kanieśnaściu isnavańnia niekalkich «Centralaŭ pavietavych kooperatyvaŭ». A što takaja kanieśnaść sapraŭdy isnuje vidać choćby z taho, što ŭžo isnuje i vielmi ŭdačna pracuje taki napr. ukrainski „Centrosajuz" — centrala ukrainskich sajuzaŭ pavietavych i akružnych. — Nia mienšaje prava na takuju samuju centralu majuć i ziemli biełaruskija.

Usiaho hetaha prapanavany prajekt nie pradbačyć — a heta-ž asnaŭny varunak usiakaha kooperatyŭnaha pačynańnia i spadziavanaj udačy.

A. K.

Samapomač nia jość dabradziejnaściu!

Samapomač jość škołaj ɦramadzkaj daśpiełaści narodaŭ!

Naša biełaruskaja „SAMAPOMAČ" akramia taɦo jość najtaniejšaj (ɦladzi na 2-ju bačynu vokładki!) ɦaspadarčaj časopiśsiu i viernym abaroncam pravoŭ biełaruskaɦa ziemlarobstva.

Pašyrajcie „Samapomač"!

Žbirajcie padpisku na dziesiatki „Samapomačy"!

mačy. Da horadu, da miaščanstva nienaviści nia mieŭ, ale budučyniu svajho kraju bačyŭ u sialanstvie, choć **dabrabyt i kultura sialanstva** sami ŭ sabie dla Fr. Stefčyka jšče metaj nia byli, a tolki **srodkam, sposabami da mety vyšejšaj, da niezaležnaści Baćkaŭščyny.**

Prasłaviŭsia Fr. Stefčyk sarhanizavańniem sialanskaha žyćcia na padstavie samapomačy. Dajšło da hetaha tak:

Staŭšysia vučycielam historyi i literatury ŭ siar. hasp. škole ŭ m. Černichavie pad Krakavam, Fr. Stefčyk adrazu apynuŭsia ŭ mory sialanskaj biady i niedastatkaŭ. Apynuŭsia, ale nia straciŭsia. Praniklivym svaim rozumam pačaŭ šukać pryčyn hetaha hora. Paruhadovaja kulturna-aśvietnaja praca Stefčyka — da inšaj nia byŭ tady jašče pryhatavany — ŭ miascovych hurtkoch kulturna-aśvietnych arhanizacyjaŭ pierakanała jaho nasampierad, što vioska cierpić i prosta zadychajecca ad niastačy hrošaŭ na zvarot i ad nieakiełzanaha lichviarstva (pazyčak na niačuvana vysoki pracent). Čynnaja natura Fr. Stefčyka nie mahła hladzieć na heta lohkavierna: Jon pačaŭ dumać ab sposabach napravy. Viedaŭ z knižak, z hazet ab probach Raiffeisena ŭ Niamieččynie. Ale hetaha było mała — sam pajechaŭ tudy ŭ 1889 h., kab da ŭsiaho pryhledzicca na miescy. Pabyvaŭ pry hetym i ŭ Paznanščynie, a viarnuŭšysia zaraz-ža prystupiŭ da prapahavańnia i zakładańnia pa vioskach aščadnicka-pazyčkovych kasaŭ pavodle systemy Raiffeisena.

Praca lohka nia jšła. Nihdzie nia vieryli, kab „chłopy" byli zdolny štości zrabić i dziela taho navat „svaje" banki ŭ Krakavie i Lvovie admovilisia dać Stefčyku pazyčku na ŭrucham-leńnie takoj kasy ŭ samym Černichavie. Ale Fr. Stefčyka heta nie złamała: Jon pastanaviŭ adkliknucca da samapomačy samych-ža sialan. Pačaŭ pracu ad uśviedamleńnia: u ziemlarobskim hurtku, u čytalni, u kaściele i pry kožnaj mahčymaści. A kali paśla hetaha prystupiŭ adnej niadzieli da zasnavańnia samaj Kasy, złažyli sialanie ŭkładaŭ na aščadnaść kala siamioch tysiač rejnskich załatovak.

Prykład m. Černichava byŭ paŭtorany ŭ paru inšych miascoch, ale kruhom jašče laža-ła ciomnaja, ciažkaja noč: za 10 hod pracy

Рэгулямін сэкцыі Эканомікі і Статыстыкі

пры Беларускім Інстытуце Гаспадаркі і Культуры ў Вільні.

I. Мэты Сэкцыі.

§ 1. Сэкцыя Эканомікі і Статыстыкі ставіць сабе наступныя мэты:

а) пазнаваньне, вывучэньне і папулярызаваньне эканамічнага жыцьця ўсіх беларускіх зямель;

б) дасьледжваньне гаспадарчай самаставальнасьці Беларусі;

в) застасаваньне здабычаў эканомікі ў жыцьці практычным дзеля падняцьця агульнага дабрабыту Краю.

II. Працы Сэкцыі.

§ 2. Дзеля асягненьня вышэй-успомненых мэтаў Сэкцыя Эканомікі і Статыстыкі:

а) ладзіць навукова-дыскусыйныя зборкі з рэфэратамі на тэмы эканомікі і статыстыкі;

б) рэдагуе, выдае і пашырае беларускую эканамічную і статыстычную літэратуру;

в) вядзе падлічэньні ўсіх сілаў і багацьцяў Краю як матэрыяльных, так і духовых і хлапоціцца аб іхным павялічэньні;

г) утрымлівае кантакт з эканамічным жыцьцём бліжэйшых і дальшых суседзяў Беларусі.

III. Сябры Сэкцыі.

§ 3. Сябры Сэкцыі дзеляцца на сяброў звычайных і сяброў супрацоўнікаў.

§ 4. Сябрам звычайным можа быць кожны сябра Бел. Інстытуту Г. і К., які ёсьць адпаведна прыгатаваны да працы ў галіне эканамічных і статыстычных навук, калі падасьць адпаведную заяву сэкрэтару Сэкцыі і будзе прыняты Цэнтр. Урадам БІГіК на прапазыцыю сэкрэтара.

§ 5 Сябрам-супрацоўнікам можа быць кожны пачынаючы працаўнік на ніве эканомікі і статыстыкі, каторы выкажа ахвоту, здольнасьць і заінтэрэсаваньне ў кірунку асягненьня мэтаў Сэкцыі і падасьць адпаведную заяву сэкрэтару Сэкцыі.

§ 6. Як сябрам звычайным, так і сябрам-супрацоўнікам можа быць і ня сябра Бел. Інстытуту Г. і К., калі падасьць адпаведную заяву сэкрэтару Сэкцыі і будзе прыняты Цэнтральным Урадам Інстытуту на прапазыцыю сэкрэтара Сэкцыі.

§ 7 Сябра-супрацоўнік можа быць Цэнтр. Урадам Інстытуту на прапазыцыю сэкрэтара Сэкцыі залічаны ў сябры звычайныя, калі выкажацца працай у навуковай галіне.

§ 8 Сябры Сэкцыі падаюць да ведама сэкрэтара Сэкцыі свае працы, а калі гэтыя працы былі апублікаваны друкам, то падаюць назоў і нумар часопісі, дзе былі друкаваны.

---

zasnavana było ŭsiaho 26 Kasaŭ, jakija adnak svajo zadańnie vykonyvali dobra.

Pobač z lichviarstvam hrašovym, hnobiła ludziej lichviarstva tavarovaje. Treba było vučyć ludziej handlu. I hetaj spravaj zaniaŭsia toj-ža Stefčyk — historyk i literaturnik. Pierš musiŭ vučycca handlovaje viedy sam, a paśla sarhanizavaŭ kurs dla pracaŭnikoŭ. Pačynajecca praca novaja. Uletku 1892 h. Fr. Stefčyk praz 6 tydniaŭ zaparam pravodzić lustracyju hetych placovak, nabaŭlajučysia pry hetym ciažkoj chvaroby żałudka, jakaja mučyła jaho doŭhija hady.

Vialiki ekanamist St. Ščepanoŭski skazaŭ raz: *„Našy karovy sto razoŭ bolšy ŭpłyŭ mohuć zrabić na haspadarku kraju, čym ministr D. i celaja Dziaržaŭnaja Rada* (*„Rada Państva“*). — Stefčyk u 1896 h. źviartaje svaju ŭvahu na mahčymaść sarhanizavańnia sialanskaha małačarstva sposabam kooperatyŭnym i heta Jamu taksama ŭdajecca. — Usie dahetulašnija kooperatyŭnyja placoŭki (kasy, kramy, małačarni) arhanizavanyja Stefčykam nia byli miž saboj paviazany, kožnaja z ich isnavała tolki dla samoj siabie. Hetki stan rečaŭ nia byŭ zdarovym. Voś-ža ŭ 1899 h. Stefčyku ŭdajecca sarhanizavać krajovy (halicki) Patronat ziemlarobskich kooperatyvaŭ, u katorym usie isnujučyja kooperatyvy złučylisia dziela ŭzajemnaj dapamohi i dziela pryhatavańnia hruntu pad zasnavańnie kooperatyvaŭ novych. Praz 5 hadoŭ, u 1904 h. Stefčyk prystupaje da redahavańnia i vydavańnia dla ŭsich abjednanych u Patronacie kooperatyvaŭ časopisi, praz katoruju trymaje ŭ biespasiaredniaj łučnaści kooperatyvy i paasobnych u kooperacyi pracujučych ludziej, stała ich vučyć, napaminaje...

Praz uvieś čas uvaha Stefčyka škiravana była adnak pieradusim na Kasy pazyčkova-aščadnaściavyja, arhanizacyjny razhon katorych ciapier, pa sarhanizavańni Patronatu (1899) i svajej kooperatyŭnaj časopisi (1904) staŭsia sapraŭdy niačuvanym: što hod arhanizavałasia 100(sto) z lišnim kasaŭ, ahulny lik jakich u kraju (Haliččyna) prad vajnoj dasiahnuŭ 1.400.

Mylaŭsia-b toj adnak, chto dumaŭ by, što ŭ hetym „razhonie“ kooperatyvy arhanizavalisia sami. Nie, vialikuju bolšaść ich arhanizavaŭ Stefčyk sam asabista.

§ 9 На паседжаньнях Сэкцыі сябры звычайныя маюць голас пастанаўляючы, а сябры-супрацоўнікі — голас дарадчы.

§ 10 На прапазыцыю сэкрэтара Сэкцыі сябра можа быць выключаны з ліку сяброў Сэкцыі пастановай Цэнтр. Ураду Бел. Інстытуту Г. і К.

§ 11 Расходы Сэкцыі ў меру сваіх магчымасьцяў пакрывае Цэнтральны Ўрад, даходы Сэкцыі паступаюць у касу Цэнтральнага Ураду.

IV. Сэкрэтар Сэкцыі.

§ 12. Усей працай Сэкцыі кіруе Сэкрэтар, які вызначаецца Цэнтральным Урадам Б.І.Г. і К. на тры гады. У выпадку ўступленьня Сэкрэтара Сэкцыі, Цэнтральны Урад БІГіК вызначае новага спасярод двух кандыдатаў, з якіх аднаго падае ўступаючы сэкрэтар, а другога сход сяброў Сэкцыі. У выпадку згоднасьці падаецца да зацьверджаньня адзін кандыдат.

§ 13. Сэкрэтар рэпрэзэнтуе Сэкцыю перад Цэнтр. Урадам і Радай БІГіК, вядзе сьпіс сяброў Сэкцыі і ёсьць адказны за працу Сэкцыі. Сэкрэтар Сэкцыі паведамляе. Цэнтр. Ўрад БІГіК. на 3 дні наперад аб кожнай зборцы Сэкцыі, падаючы пры гэтым парадак дня зборкі.

§ 14. Сэкрэтар Сэкцыі, калі гэта акажыцца патрэбным, дабірае сабе заступніка спасярод сяброў Сэкцыі. Заступнік памагае сэкрэтару ў працы і заступае яго падчас няпрысутнасьці.

§ 15 Сэкрэтар Сэкцыі што-год падае справаздачу з дзейнасьці Сэкцыі на сходзе Рады БІГіК. У выпадку бяздзейнасьці або непарадкаў у Сэкцыі, Рада праводзіць рэформу Сэкцыі і, калі гэта акажацца патрэбным, вызначае новага сэкрэтара.

V. Зборкі сяброў Сэкцыі.

§ 16 Зборкі сяброў Сэкцыі дзеляцца на арганізацыйныя і навуковыя. На арганізацыйных зборках абгаварываюцца арганізацыйныя працы і наагул арганізацыйныя справы Сэкцыі, а на навуковых адбываецца чытаньне рэфэратаў, дыскусія і іншая праца навуковага характару.

§ 17 На арганізацыйных зборках могуць быць толькі сябры Сэкцыі, як звычайныя так і супрацоўнікі, а на навуковых — і асобы прошаныя, як госьці.

§ 18 На зборках Сэкцыі справы вырашаюцца звычайнай большасьцяй галасоў прысутных звычайных сяброў Сэкцыі.

VI. Зьмена рэгуляміну Сэкцыі.

§ 19. Зьмена рэгуляміну Сэкцыі або дапаўненьне яго праводзіцца на арганізацыйнай зборцы Сэкцыі звычайнай большасьцяй галасоў прысутных звычайных сяброў Сэкцыі і падлягае зацьверджаньню Цэнтр. Ураду БІГіК.

§ 20. Аб рэканструкцыі або ліквідацыі Сэкцыі пастанаўляе Цэнтральны Ўрад БІГіК.

Stykajučysia hetak z arhanizavanymi kasami biespasiaredna, znaŭ Stefčyk vielmi dobra ichnyja patreby i bačyŭ, jak kanieśnaj dla ich jość nia tolki rada i dobraje słova, ale i arhanizavanaja pomač kredytu. Ale patrebu hetaj pomačy bačyła i razumieła taksama i aŭstryjackaja stalica Viena (Wien) i na hetym chacieła śpiačy svoj tłusty blin. Aŭstryjackija palityki (Haliččyna ŭ toj čas naležała da Aŭstryi) razumieli, što kali jany sarhanizujuć u Vienie kredytovuju centralu i nakinuć hety kredyt kooperatyvam Stefčyka, dyk hetym samym da tej-ža Vieny pryviažuć usio haspadarčaje žyćcio i buduć mieć z hetaha karyści nia tolki materyjalnyja, ale i palityčnyja. — Bačyŭ heta Stefčyk i razumieŭ, jak niebiaśpiečnaj była-b takaja kazionnaja „apieka" dla kooperatyvaŭ i tamu da jaje nie dapuściŭ, arhanizujučy ŭ 1909 h. centralnuju krajovuju Kasu. Z davajennaj čynnaści Stefčyka hety mament zasłuhoŭvaje na asablivaje pryznańnie.

Vybuch i źmiennyja losy vajny i ŭreščie palityčnaje ŭniezaležnieńnie Polščy paklikali Fr. Stefčyka na placoŭki novyja, šyrejšyja: kooperataram adnak nie pierastaŭ Jon być ni na minutu. 30.6.1924 h. byŭ Fr. Stefčyk imienavany prafesaram kooperacyi Krakaŭskaha universytetu: hetaha adnak jašče dnia pierastała bić jaho nadludzkaje serca.

Usio žyćcio Fr. Stefčyka, apošnija chviliny Jaho i sama ŭreščie śmieć heta adna biaskoncaja słužba čałaviectvu, vypłyvajučaja nia z ludzkich mierkavańniaŭ, ale z Chrystovaj lubovi da bližniaha: pačynaŭ svaju pracu Fr. Stefčyk relihijnaj prysiahaj i žyćcio pracoŭnaje končyŭ — malitvaj na vusnach. U XX vieku źjavišča heta niaštodziennaje.

Stefčyk pamior... Ale ludzi Jahonaj miery „choć pamierli—žyvuć viečna". Tamu Stefčyk žyvie i žyć budzie ŭ svajej pracy, u svajej lubovi...

Dla nas Biełarusoŭ siańnia imia Stefčyka, biez Jahonaj i našaj voli, nažal, źjaŭlajecca synonimam nacyjanalnaj kryŭdy na našu niekaryść. Paŭtarajem — biez Jahonaj voli! Heta daje nam prava i mahčymaść pakłanicca pamiatcy Vialikaha Vučyciela ludzkoj samapomačy i adnavić sabie ŭ pamiaci Jahonyja nakazy **niaprymańnia čužoj „apieki"**, bo za joj toicca biazdušnaje vykarystoŭvańnie. Samapomač pamahaje pavolna, ale stała i całkom peŭna. *A.*

Сельская гаспадарка.

Панская ласка на рабым кані езьдзіць

або

— Нашто хочуць асушываць Палесьсе?

Раз за разам праскаківаюць у газэтах і на розных зборышчах весткі аб тым, як нехта, нейдзе, нешта аб нас добрага думае, хлапоціцца і мяркуе як-бы „пабацькаўску" нам у бядзе памагчы. А людзі „пачцівыя" (чытай — наіўныя або проста глупаватыя: з прыроды ці па сваей віне) часам і вераць гэтым басьням, як нечаму праўдзіваму. Тымчасам за такімі „дабрадзействамі" заўсяды стаіць зусім што іншае ад таго, што адкрыта і моц на гаворыцца. Аб гэтым звычайна даведваемся толькі выпадкова, бо-ж ведама, што шыла з мяшка заўсяды вылезе, раз пазьней толькі, а раз хутчэй.

Гэтак вось сталася і з шырока-раскрычанымі „добрымі" намерамі асушкі нашага Палесься. Адзін—другі „пачцівец" ўжо думаў, што і сапраўды наш паляшук дастане з асушанай плошчы пядзі дзьве зямлі. Гэтым салодкім сном-мрыям палажыў аднак канец афіцыёз польска-казённых самаўрадаўцаў „Samorząd" (№ 14), праз вусны інж. Гэрнічка, які сапраўдныя мэты асушкі Палесься прадстаўляе гэтакім парадкам:

1. На Палесьсе перасяліць надбытак людзей з „пералюдненых" захадных прамысловых вакругоў Польшчы;
2. падняць гаспадарку самога Палесься.
3. выкарыстаць ваду з асушаных абшараў на ўмацаваньне абароны ўсходняй граніцы Польшчы.

На прадбачаную асушку, хоць і ў абмежаных граніцах, патрэбна ўсё-ж 200—300 мільёнаў залатовак. Дабыць гэтыя грошы той-жа інж. Гэрнічэк радзіць гэтак:

Дабіцца грашовай помачы на асушку ад ураду (грошы з падаткаў!) і налажыць абавязак помачы ў натуры на „заінтэрэсаванае(?)" насельніцтва і паветавыя самаўрады.

Пакуль мова аб дапамозе з дзяржаўнага скарбу, можна йшчэ справу так ці гэтак вытлумачыць, бо ў казну плацяць падаткі ўсе. Горш затое стаіць справа з помаччу „заінтэрэсаванага" насельніцтва „ў натуры" (шарваркі!) і таксама з помаччу з боку „заінтэрэсаваных" хіба паветавых самаўрадаў. Тут дык ужо ня то што кпіны ў вочы, але проста зьдзек: шарварку — адбывай Паляшук, наказаў бязвыбарных „заінтэрэсаваных" паветавых палескіх «Соймікаў" — слухай і выконывай Паляшук, а як прыйдзе да надзелу палескай зямлёй, асушанай мазалём палескага мужыка, дык прысылаюць на гэта сюды чужых людзей з „пералюдненых" вакругоў Польшчы і ім палескую зямлю раздаюць, а Паляшук як быў голы, так і аставайся.

Ці-ж можа быць лепшы прыклад чужой „апекі"?

Панская ласка, сапраўды, на рабым кан езьдзіць!

Васіль Б.—Паляшук.

Zaraza hryba ŭ budoŭli.

Zaraza hryba ŭ budoŭli, zdolnaja za niekalki hod źniščyć najlepšy navat budynak, pačatak svoj maje ŭ vielmi drobnym zarodku, jaki dziela svajho razrostu patrabuje adpaviednaj vohkaści, ciapła i syroha dreva ci inšaj hetak zvanaj arhaničnaj (žyvoj) masy dziela kormu dla siabie; akramia taho hety škodnik patrabuje krychu pavietra (pravievu) i nia lubić śviatła.

Nazvanyja vymohi ci varunki raźvićcia hryba ŭ budoŭli sami jasna pakazvajuć, čaho treba vyścierahacca i što rabić, kab hetu zarazu ŭ budynak abo susim nia ŭpuścić, abo ŭpuściŭšy — stul jaje vyhnać.

Pieršaj spravaj jość nie davać u budynak syroha i syravataha dreva naahul, a asabliva— tudy, kudy nia maje dostupu ani śviatło, ani v o l n a j e pavietra (zatynkavanyja ci zašalavanyja ścieny), abo prosta zahrožana vilhaćciu (belki pad padłohaj). Budaŭlanaje dreva dziela hetaha treba rubać uzimku (m-cy: śniežań, studzień, luty), kali jano nia maje za šmat „soku", i abskrabaŭšy złažyć u kletku, ci ŭ pierakładku, kab v y s a c h ł a i nie datykałasia. Niedasochšaje dreva moža być užytym tolki ŭ takija miascy budynku, abo i na cełyja budynki, jakija cały čas majuć volny dostup pavietra, napr. klučy, krejki i łaty pad strechami, adryni, humny, śvierny i im pad.

Kali-b tak zdaryłasia, što niedasochšaje dreva treba było kłaści ŭ syraść, pamiž tynk ci ŭ šaloŭku, dyk tady treba nasampierš jaho naležna zabiaśpiečyć pry pomačy adpaviednaj dezynfekcyi: u hustym rastvory kuchonnaj soli, u hazie (karasinie), u naftovaj ropie, u karboli, u miednym ci žaleznym vitryoli, ci ŭrešcie ŭ specyjalna pryhatavanym karbolineum'ie, abo ŭ antymerulion'ie. Ačyściŭšy dreva, mažać jaho najmienš dvojčy h a r a č y m katorym-niebudź z nazvanych dezynfekcyjnych srodkaŭ.

Apriača samoha budaŭlanaha dreva, pilnuju ŭvahu treba źviarnuć na nasypy pad padłohaj. Ni pad jakim vidam nia možna davać na nasypy ŭradžajnaj zianıli z pola i tymbolš — z harodu, nia možna na nasypy davać usiaki hruz z starych damoŭ, piłaviny, miakinu i asabliva — usiakija niačystoty: hustyja i navat vadzianistyja (husty i vadzianisty kał). Na nasyp

Пустазельле гэта абжора і злодзей нашых палёў.

Ня ўсё золата што блішчыць, ня ўсё цешыць што зялянее і цьвіце. На палёх нашых сялян, ня раз нават і г. зв. „добрых гаспадароў,“ зялянее і цьвіце ня толькі якое-сь там збожжа, канюшына, акопніна, але і найзвычайнейшае пустазельле, як **асот**, **сьвірэпка**. Гэтае пустазельле на полі — гэта благое, можа нават найгоршае пасьведчаньне для гаспадара; тымгоршае і небясьпечнейшае, што гаспадар часта шкоднасьці такога пустазельля ня толькі не разумее, але ўважае яго нават карысным, Тымчасам жыцьцё і навука найвыразьней даказалі, што такое пустазельле, гэта ўтаены злодзей і абжора нашых палёў, які выбірае з зямлі ўсякай спажывы і вады ў дзесяць разоў больш, чым расьціна культурная (пасееная), а не дае карысьці і за адну такую-ж расьціну. Дзеля таго ўсякае пустазельле трэба праз увесь час старанна нішчыць: у карані, у сьцяблі, у цьвеце, у зярняці.

Кепска робіць той гаспадар, што думае толькі сяўбу як-небудзь пасеяць, а ўсю дальшую апеку над ёй „паручае“ Богу: гэтак рабіць ня можна, трэба аб гэткай апецы парупіцца і самому.

Чуткія на шкоду ад пустазельля ўсе гаспадарчыя расьціны, але найбольш хіба гэту шкоду адчуваюць нашы акопніны (бульба, бурак, морхва). Іх дзеля таго трэба ад пустазельля і бараніць, хоць ня можна таксама дапускаць, каб жоўтым „мёдам“ сьвірэпкі цьвілі і нашыя ячмяні, аўсы, гарахі і інш. Трэба раз назаўсёды ўцяміць сабе тую праўду, што далёка карысьней засеяць для сьвіней напр. жывакосту (глядзі № 9-10 „Самапомачы“ за 1933 г.) ці іншай зялёнай пашнай расьціны, чым гадаваць на полі такую сьвірэпку, ці асот.

Дык трэба нішчыць пустазельле ў самым зародку: як толькі пачынае ўсхадзіць. Ня можна чакаць, пакуль яно разрасьцецца, бо-ж гэта гатовае марнатраўства. Палоць і вырываць пустазельле трэба дакладна, бо надарванае толькі пустазельле вырастае ўзноў з караня. Пры тым такое поліва трэба выкснываць ня раз і ня два, а так доўга, пакуль пустазельле паказваецца, а сама пасаджаная ці пасееная расьціна на гэтулькі йшчэ не скрэпне, каб такое пустазельле магчы заглушыць.

Бульбу. як толькі абойдзе, трэба баранаваць упоперак лёгкай бараной. Добра зробіць той. хто пабаранаваўшы гэтак бульбу пасьля йшчэ пройдзецца тымсамым полем, ды выпадкова выцягненыя бараной расткі бульбы паўсаджвае ўзноў на месца, у зямлю. Выбаранаванае пры гэтым пустазельле трэба старанна з поля пазьбіраць, бо йнакш можа яно нанова абыйсьці.

Дзе ў гаспадарцы хапае рук да працы, там гультаваць яны не павінны. Замест з бараной, нішчыць трэба пустазельле матыкай: больш скуткоўна зьнішчыцца пры гэтым пустазельле і ральля станецца пульхнейшай.

Вырасшую на далонь бульбу ў нас аборываюць. Але і гэта аборываньне, пры вы-старчальным ліку працоўных рук, можа быць заменена абсыпаньнем ручным. Паўтараецца яно разы тры-чатыры.

Ячмяні, аўсы, ляны і інш. ярыну трэба з няменшай стараннасьцяй бараніць ад пу-

---

pad padłohu pryhodnyja: čysty suchi piasok, čystaja hlina, žvir, kamiennavuholnyja adpadki (žužli), vysušany torf źmiašany z hašanaj vapnaj.

Vielmi škodnym i niebiaśpiečnym jość zašalovyvać, a tymbolš — zatynkovyvać śvieżyja ścieny, jak heta nakazvaje siańniašniaja, z budaŭlanaha punktu hledžańnia nierazumnaja „moda“.

Zdarajecca adnak, što mały niedahlad pry budovie byvaje pryčynaj taho, što ŭžo na treci hod z-pad padłohi raptam pakazvajucca biełyja nitki, a to i cełyja „bliny“ biełaj masy. Kali ŭ hetym miescy addziorci z padłohi došku, dyk zvyčajna možna byvaje pabačyć tam roznaj hrubini šeryja nitki, katoryja ŭ peŭnych miascoch tvorać tyja-ž biełyja, z časam — rudavatyja „bliny“: heta daśpieŭšaje ŭžo nasieńnie budaŭlanaha hryba, jakoje vielmi lohka moža być nieaściarožnymi rabotnikami zaniesiena na miesca zdarovaje i tam pačać na nova svaju razburajučuju pracu.

Dreva zaražanaje budaŭlanym hrybom paznajecca pa tym, što pry ŭdary ab jaho čujecca hłuchi huk, samo dreva tracić na vytrymałaści, maje charakterny vostry zapach, ajčviek, uhnany ŭ takoje dreva, lohka vyłazić nazad.

Ratavać budynak ad zahnieździŭšahasia ŭ im hryba naahuł — ciažka. Treba nasampierš usie miascy budynku z hrybom paadkryvać ad usiaho, što jaho prykryvaje: tynk, šaloŭka, nasyp i h. p. Chvoryja čaści dreva abčesyvajucca da zdarovaha „miasa“ i pakidajucca pamahčymaści daŭžej, kab vyvietrali; rešta — dreva i muru — staranna abčyščajecca ad pyłu vostraj ščotkaj i ŭsio heta paśla nacirajecca taksama jak i pry vyžej apisanym zabiaśpiečvańni ad hryba dreva syravataha. Zachavać pry hetym treba aściarožnaść, kab nie pieranieści chvaroby. Usio-ž zaražanaje dreva, treski treba spalić, a vybrany z-pad padłohi zaražany ci tolki ŭ hetym zapadozrany nasyp — adviešci na staranu i hłybaka zakapać

(*Pavodle inž. D. K.*).

Ad redakcyi: U hetaj-ža spravie my atrymali ad daznanaha budavielnika i architekta vielmi cennyja i cikavyja **„Zaciemki ab chatnim hrybie“**, jakija źmieścim u nastupnym numary „Samapomačy“.

Губеце майскіх жукоў!

Хто ня ведае гэтых шкоднікаў?! Але сьмела можна сказаць, што і палова тых людзей, што знаюць майскага жука, не ўяўляе сабе ўсіх шкодаў, якія ён у гаспадарцы робіць, асабліва калі размножыцца ў такім ліку, як гэта мае месца сёлета. Газэты нядаўна разьнясьлі па цэлым сьвеце вестку, што напр. у некаторых мясцовасьцях Нямеччыны, дзякуючы раньняй і цёплай сёлетняй вясьне, лічба гэтых жукоў так размножылася, што па захадзе сонца яны лятаюць цэлымі хмарамі і, б'ючы аб твар падарожных, не пазваляюць нават ім пасувацца наперад.

Шкодны майскі жук ня гэтулькі сам, колькі сваімі пакладанымі ў зямлі зародкамі, гэт. званымі дратнякамі, якія бываюць вельмі жыркімі і аб'ядаюць карэньні культурных расьцінаў. У народнай-жа мове такое пад'яданьне ведамае як пад'яданьне рабака; бо зародак майскага жука сапраўды і выглядае як звычайны цьвёрды (дрот!) рабак. Сам-жа майскі жук шкодзіць тым, што кладзе ў зямлю свае зародкі і аб'ядае лісты дрэваў і расьцінаў, на каторых раніцай і днём спакойна і бястурботна сабе адпачывае.

Дзеля ўсяго гэтага трэба нішчыць як самога майскага жука, так асабліва ягоныя зародкі ў зямлі, вышэй названых дратнякоў. Гэтых апошніх добра выбіраюць за плугам куры, вароны і інш. птушкі. Нішчыць дратнякоў і мароз, калі ўвосені поле бывае загараным і зазімуе ў востарай баразьне (небаранаванай).

Жукоў-жа самых мусіць нішчыць сам гаспадар беспасярэдна, тым-больш, што яны могуць быць вельмі добра выкарыстаны ў гаспадарцы. Робіцца гэта так:

Пад дрэвы, на лістох каторых жукі адпачываюць па вячэрняй і начной сытай бяседзе, падсьцілаюцца посьцелкі, а само дрэва хутка але моцна страсаецца. Ад гэтага жукі звальваюцца на падсьцеленую посьцелку, скуль трэба іх ссыпаць у вядро і заліваць загадзя прыгатаваным вараткам. Робіць усё гэта трэба хутка, але бяз лішняга крыку і суталкі, ад каторай жукі хутчэй толькі прачынаюцца і разляютаюцца.

Запараныя гэтак гарачай вадой і пасьля высушаныя майскія жукі могуць быць ужытыя як добры і смашны корм для сьвіней, і курэй. Корм гэты можа быць спатрабаваны зараз-жа, можа быць перахоўваны ў вісячых у правеўным месцы мяшкох ці карзінах і кошыках, або можа быць змолаты на муку, якая яшчэ лепш прыгодна да абмешкі сьвінной ці курынай пашы.

Да зьбіраньня жукоў найлепш заахвоціць дзяцей, плацячы ім па 5—10 грашоў за назьбіранаее вядро гэтых шкоднікаў. **А. Ш**

стэзельля і палоць. Ні ў якім выпадку ня можна пазволіць каб сьвірэпка на полі цьвіла: раз што яна да гэтага часу надта шмат абкрадае поле, а найважней тое, што за цьветам уміг сьпее ўжо і насеньне, якім пасьля засьмечываецца поле і надалей.

На полі мусіць расьці тое, што пасеена: пустазельле-ж, як сапраўднага злодзея нашых палёў, трэба нішчыць! **С. Я.**

Vykarystoŭvajcie sonca!

Nadyšła viasna, leta blizka. Kožnaja žyviolinka, kožny žučok, kožnaja travinka i bylinka chinucca da sonca. Ciešacca dzietki z dobraj pahody i cely dzień biehajuć nadvory. Tolki ŭ niekatorych starejšych, a pieravažna dziaŭčat, źjaŭlajecca bajaźlivaść, kab nie zahareć: jak-ža jany mylacca i škodziać samym sabie! Čystaje pavietra i sonca heta najlepšaje lakarstva dla našaha arhanizmu. Kab u nas byli padrad dźvie zimy, dyk z niedachopu pavietra i sonca vymierła-b $^1/_8$ dziaciej i $^1/_5$ starejšych.

Sonіečnyja pramieńni pryśpiešyvajuć pieramienu materyi — pajaŭlajecca apetyt, robiać adpornym arhanizm na skurnyja chvaroby, „vyhaniajuć" reŭmatyzm, źmianšajuć boli i nacioki pry artretyźmie, u dziaciej z angielkaj pryčyniajucca da narmalnaj pieramieny vapny, uspakajvajuć nervy, lečuć suchoty kaści i h. d. i h. d. Słovam, sonca pamoža kožnamu, za vyniatkam: duža schvareŭšych i małakroŭnych, suchotnikaŭ i naahuł chvorych ciažka na lohkija i serca. Hetym apošnim lepš prabyvać u ciani.

Adnak, kab sonca nam dało karyść, musimo naśviatlać svoj arhanizm pavodle nastupnaha planu:

1. Zaŭsiady treba mieć nakrytuju čymniebudź hałavu, kab nie nastupiŭ sonіečny ŭdar, a pieradusim tady, kali my tolki pačynajem naśviatleńnie.

2. Pieršy raz — raździeŭšysia susim hre jemsia tolki $^1/_2$ hadziny, druhi dzień — hadzinu, treci dzień — dźvie i h. d.

3. Zaŭsiady treba na soncy pieravaračyvacca, kab nie spalić u vadnym miescy skury i kali choć kryšku zrobicca słaba, ci dušna, treba adyjści ŭ cień.

4. Abjadacca, asabliva tłustaha, pierad naśviatlańniem nia možna.

5. Nahreŭšysia nia možna adrazu kidacca ŭ vadu, a tolki treba pavoli abmačyvać čaści cieła, a paśla ŭžo kupacca. Najlepš heta rabić, kali sonca ŭžo nia tak piače.

Kali-b zdaryŭsia vypadak sonіečnaha ŭdaru, dyk chvoraha treba najpierš tak pałažyć, kab hałava jahonaja była vyšej usiaho cieła. Dalej, na hałavu kładziom zimny kampres abo lod, a na nohi dajom kampres ciopły. Vakolicu serca treba dobra pieracirać zimnoj vadoj. Paśla padajucca chvoramu razvalniajučyja srodki, napr. senes („stručki"), rycyna i pad. Dalšyja (ciažejšyja), sposaby ratavańnia, jak pabudžańnie serca, davańnie ŭkołaŭ, puskańnie kryvi i inš. moža pravodzić tolki asoba, jakaja znajecca na lekach. *J. M.*

Май ў пчальніку.

У меру таго, як робіцца цяплей і прыбывае пажытку, пчаліныя маткі кладуць больш яечак і сіла пчалінай сям'і ўзрастае. Разумеецца, залежыць гэта ад вясны: ці яна цяплейшая ці халаднейшая; залежыць і ад ваколіцы: ці бяднейшая яна, ці багацейшая на мядовыя расьціны. Але нават у адным і гэтым жа пчальніку ня ўсе пчолы аднолькава разьвіваюцца.

Пчолы, якія выйшлі з зімы моцнымі і мелі здавальняючы запас мёду, разьвіваюцца хутчэй і наадварот, слабыя раі даходзяць да сілы вельмі памалу. Пераменная пагода на вясну бывае вельмі небясьпечнай для пчолаў.

Падчас цяплыні матка можа ўсё гняздо заняць чарвой, а калі пасьля цяпла наступіць некалькі дзён халодных і дажджлівых, дык пчолы зьеўшы ўвесь свой запас мёду могуць асыпацца з голаду. А хаця-б нават і не асыпаліся, то могуць змарнаваць маладую чарву, бо яны яе высысаюць і ўжываюць на корм для старэйшай чарвы. Дзеля гэтага падчас непагоды, калі ў ваколіцы няма добрага мёдазбору, а ў вульлёх ня было здавальняючага запасу мёду, трэба безадкладна раі падкарміць і цёпла накрыць.

Калі падчас добрай, цёплай пагоды заглянем у сярэдзіну вульля і пабачым, што ўсе плястры занятыя чарвой і мёдам і матка ня мае дзе класьці яечак, а пчолы — мёду, то значыцца наступіў найвышэйшы час, каб дадаць пчолам яшчэ рамкі.

Калі маем у запасе гатовую вашчыну, то даём яе, уважаючы, каб яна была чыста пчаліная, бяз трутовых чарачак, бо йнакш матка наразводзіць трутоў.

Калі вашчына ня чыста пчаліная, то можам кускі з трутовымі чарачкамі павырэзываць і ўштукаваць пчаліныя.

Трэба таксама сачыць, каб падчас расплоду не даваць старой чорнай вашчыны, бо з такой вашчыны выходзяць ненармальна малыя пчолы, якія ў цесных чарачках ня могуць належна вырасьці і разьвіцца. Калі няма ў запасе вашчыны натуральнай, даём вузу.

Ніколі ня трэба дадаваць адразу больш чым адну, найбольш дзьве рамкі, бо дадаўшы больш можна ахаладзіць гняздо і ўстрымаць працу пчол.

Л. Войцікава.

Папраўка.

У апошнім (4-тым) нумары „Самапомачы" на бачыне 31-ай, у стацьці „Прад саджэньнем бульбы", у 35—36-тым радкох зьнізу закралася з пасьпеху прыкрая абмылка: Надрукавана „на 10-цёх квадратных мэтрах (10 мэтраў удаўжкі і 10 — упоперак), а павінна быць „на 10-цёх квадратных мэтрах (4 мэтры ўдоўжкі і $2^1/_2$ мэтры ўпоперак". — Просім нашых Паважаных Чытачоў гэту абмылку паправіць.

РЭДАКЦЫЯ „САМАПОМАЧЫ".

Летняе гнаеньне агародаў.

Трудна спадзявацца добрага ураджаю агародніны, калі не хапае пад яе неабходнай колькасьці ўгнаеньня. Звычайна для ўгнаеньня агародаў ужываецца хляўны гной; але сягодня, калі колькасьць жывёлы значна паменшала, яго ёсьць так мала, што на патрэбы гаспадаркі ніяк хапіць ня можа. Закладаньне кампостных кучаў, нажаль, яшчэ мала распаўсюджана, дык і нашы агароды выглядаюць вельмі няцікава і даюць мала карысьці.

Справу можна палепшыць распачаўшы летняе гнаеньне адпаведна прыгатаванымі гнаёвымі жыжкамі. Гнаёвыя жыжкі — вельмі моцныя і хутка дзеючыя. Іх надта карысна ўжываць дзеля таго, што матэр'ялаў угнаеньня разыходзіцца мала, а ўраджаі шмат разоў павялічваюцца.

Гнаёвыя жыжкі можна прыгатаўляць як з конскага, так і з кароўяга гною; але там, дзе радзіцца ўжываць штучныпа гной — салетру, там найкарысьней стасаваць жыжку з гною курынага. Курыны гной, паводле складу пажыўных частак, прынамсі ў 5—6 разоў мацнейшы за іншыя гнаі, а 1 кілёграм яго мае тое самае значэньне, што і 1 кіл. салетры.

Прыгатаўляюцца гнаёвыя жыжкі наступным спосабам.

У кутку агароду трэба ўкапаць ў зямлю нецякучую бочку селядзёўку, напоўніць яе да паловы навозам і даверху наліць вадой. У працягу 3—4 дзён мяшаць гэта палкай аж да нізу, каб навоз добра разыйшоўся. Калі пагода цёплая то праз нейкі тыдзень на паверхні сумесі пакажуцца бурбалкі і пена. Гэта значыць, што жыжка пачала фэрмэнтаваць. Праз некалькі часу бурбалкі зьнікаюць і вось дзён праз 10—12 ад таго часу як ссыпалі ў селядзёўку навоз, можна ужо ім карыстацца.

Але такая гнаёвая жыжка вельмі моцная, дык каб яна не пашкодзіла расьлінам, трэба яе разбаўляць вадой бяручы на кожнае вядро жыжкі з конскага ці кароўяга гною 3—4 вядры вады, а на 1 вядро жыжкі з курынага гною —5—6 вёдзер вады.

Паліваць гнаёвымі жыжкамі агароднія расьліны трэба разы 3—4 ў працягу лета.

Найлепшым часам дзеля паліўкі зьяўляецца або вечар, або хмарная пагода, бо тады ўгнаеньне ня высыхае ад гарачыні; а каб яно ня так хутка ўвайшло ў глыбіню зямлі і належна было выкарыстана расьлінамі, трэба паліваць толькі вільготную глебу: або пасьля дажджу, або паліваць спачатку звычайнай вадой, а тады угнаеньнем.

Пачынаць паліўку трэба тагды, калі на расьліне ўтворыцца некалькі звычайных лісткоў, апрача лісьценяў, і калі расьліны добра прымуцца і пусьцяць моцныя карані. Пры паліўцы трэба зварочываць увагу, каб ня ліць на лісьцё, бо яно можа апаліцца.

У абарону... сьвіней.

Прыкрая гэта сапраўды рэч быць сьвінскім абаронцам, ды яшчэ прад кім? — прад чалавекам! Але-ж яшчэ горш сваімі паступкамі гэткую абарону выклікаць. Дык бліжэй да справы.

Непрадуманае да канца, шаблённае касаваньне трохпалёўкі ідзе ў нас звычайна поруч з касаваньнем пасьбішчаў, а ўласьціва — папараў. На добры лад нічога ў гэтым благога, тымбольш, што абсалютная бальшасьць нашых пасьбішчаў гэта нават і ня пасьбішчы, а звычайны выган, заняцьце якога пад пасеўную расьліну магло-б быць толькі карысным. І яно так сапраўды ўсюды і было-б, калі-б такое пасьбішча мела за заданьне толькі накармленьне пасомай жывёлы. Але-ж яно так ня ёсьць, бо пасьбішча, апрача корму, дае йшчэ жывёле магчымасьць карыстаньня з дабрадзействаў **руху, сьвятла і чыстага паветра**. А гэта ў жывёлагадоўлі ёсьць вельмі важным. Як ня можна трымаць у цёмным і сырым катуху жывога чалавека, так ня можна ў такім катуху — а нашы хлявы, асабліва для сьвіней, назваць можна толькі катухамі — трымаць і немую безбаронную жывёлу. Проці гэткага трыманьня гавора ня толькі людзкое сумленьне, але і звычайнае гаспадарчае вырахаваньне: жывёла трыманая бяз руху і бяз вольнага паветра, ня можа расьці і карамжацее, як ня вырасьце ў ценю і здаровая расьціна.

Тымчасам што дзеецца ў нас? А вось: пры скасаваньні трохпалёўкі неразумная людзкая прагнасьць заграбае ўсё поле пад пасевы, не пакідаючы ані крошкі вольнага месца, дзе гадаваная жывёла магла-б калі не накарміцца дык прынамся глынуць чыстага паветра і папраставаць сабе ногі. Трудна згадаць, што тут мае перавагу: ці скупасьць на ўтрыманьне чалавека, які даглядаў-бы пасомую жывёлу, ці няўмеласьць зрабіць выгарадню, дзе гэткая жывёла нейкі час — або і круглы дзень! — магла-б аставацца і бяз сумыснага дагляду, ці — найскарэй! — людзкая цемната і неразуменьне, што гадаваць аплачваецца толькі жывёлу здаровую, а для здароў'я патрэбны ня толькі корм, але ў роўнай меры таксама: **рух, сонца і паветра.** А. К

Пасьля паліўкі на паверхні зямлі ўтвараецца як-бы скарынка, якая не дапускае да каранёў расьліны цяплыні і паветра, не дае ей добра разьвівацца. Гэтую скарынку трэба нішчыць, успульхняючы зямлю навокал расьлін.

Паліваньне гнаёвымі жыжкамі карысна для ўсей агародніны. І капуста, і буракі, і морхва, і пятрушка, і памідоры добра адплацяць нам нашыя стараньні.

У канцы мушу зазначыць, што паліўка трускавак гнаёвай жыжкай з курынага гною з попелам дае вельмі добрыя і пажаданыя вынікі. Л. В.

Карбункул.

(*Anthrax*).

Карбункул гэта заразная, хутка-дзеючая хвароба, выкліканая сумысным бацылам; спатыкаецца ва ўсіх хатніх зьвярат, а таксама ў зьвярат дзікіх, што знаходзяцца ў зьвярынцах і можа быць перанесена з жывёлы на чалавека. Спасярод жывёлы найчасьцей хварэе на карбункул скаціна і авечкі, радзей коні і сьвіні і сусім рэдка каза і сабака.

Бацылы карбункулу знаходзяцца ў крыві хворай жывёлы і могуць быць перанесены з жывёлы на жывёлу толькі пры ўжываньні закрываўленага прыладзьдзя (напр. пры пусканьні крыві), далей спажыцьцём мяса, малака і крыві з хворай жывёлы і падобнымі спосабамі. Звычайна аднак хвароба не пераносіцца ад жывёлы на жывёлу, але жывучыя зародкі (споры) карбункулу пераходзяць на жывёлу з саломы, пошару, на каторых гэтыя зародкі трымаюцца. Гэтыя зародкі вырастаюць тут памалу з бацылаў карбункулу, якія вышлі з цела жывой або хворай жывёлы з крывавымі часткамі. Дзеля гэтага трэба заўсяды старацца чыста прыняць ня толькі трупы (падлу) паўшай на карбункул жывёлы і крывавыя іх адпады, але таксама ўсе прадметы і самую зямлю апырсканую крывёй хворай жывёлы...

Зародкі карбункулу могуць дастацца на сенажаці, пасьбішчы таксама з адпадавымі водамі і іншымі астаткамі з гарбарняў, што вырабляюць скуры і далей, з скурамі і касьцяным гноем...

Хвароба можа пераносіцца йшчэ пашай з заражаных ваколіц, або спажываньнем бульбы ці буракоў закапаных у яму, дзе прад некалькімі хоць-бы гадамі была закапана падла паўшая на карбункул, або калі з такіх мясцоў бярэцца пясок, зямля ці гліна ў хлеў, на панадворак, на сьцежкі і дарогі. Ведамы таксама выпадкі, калі зародкі карбункулу былі занесены з іншых краёў разам з зярном (аўсом), вотрубамі, жмыхамі і іншай пашай. Карбункул спатыкаецца адзіночна, радзей — масава.

Адзнакі ў жывой жывёлы. Адзнакі карбункулу за жыва залежаць ад характару хваробы. Жывёла можа захварэць нагла, на пасьбішчы, у хляве або пры працы і згінуць ўжо за некалькі мінут, быццам ад паралiжу (асабліва ў авечак), або трывае хвароба некалькі гадзінаў часу, часам цэлы дзень (востры корбункул); пры гэтай хворме жывёла раптам, без відавочнай прычыны, становіцца мляўкай, баязьлівай, стане трасьціся, поўсьць становіцца дыбам, перастае есьці і грацiць жвачку, часта бываюць пры гэтым болі жывата і надыманьне, а праз нейкі час крывавае развальненьне, а то і выцёк крыві з натуральных адбытовых мясцоў. Цяплыня цела паказвае гарачку, а дойная карова раптам зарывае.

Урэшце можа быць хворма карбункулу павальнейшая, якая кончыцца сьмерцю толькі цераз 2—7 дзён. Тут, акрамя пералічаных адзнакаў, можна заўважыць яшчэ хуткае худзеньне, страту сілы і часам болі ад алькаў; у сьвіней здараецца часам з аднаго або з двух бакоў шыі пухліна, а дыханьне становіцца цяжкім, з хрыпеньнем. Скура можа быць хваробай не дакранута, часам аднак зьяўляюцца гузы, спачатку гарачыя і балючыя, а пасьля сьцюдзёныя і небалючыя.

Скаціна хварэе звычайна на карбункул вострый; выпадкі параліжнага карбункулу трапляюцца часам на пачатку масавай заразы. У каня здараецца звычайна карбункул востры або павольны. У сьвіней, акрамя хвормаў вострай і павольнай, магчыма яшчэ хворма абмежаваная на адно толькі якое-небудзь месца (шыя, горла, кішкі), а відавочных адзнакаў можа і ня быць.

Адзнакі на падле, пасьмертныя. Пасьмертныя адзнакі спатыкаюцца адзіночна і масава і бываюць наступныя: крывавы выцёк з адходнага месца, селязёнка становіцца чорнай сусім ці толькі ў часьці, кроў падобная да дзёгцю, не запякаецца, ценькія кішкі ў цэласьці або толькі ў часьці становяцца сіня-чырвонымі...

Др. Ю. З.

Выпадкі карбункулу блізу заўсяды канчаюцца сьмерцю. Аб лячэньні жывёлы ўжо заняпаўшай на карбункул блізу няма мовы. Тымбольш трэба сьцерагчыся затое ўсяго таго, што заразу можа ў гаспадарку прынесьці і аб чым дакладна было сказана на пачатку вышэй пададзенага апісаньня. Выпадкі карбункулу трэба безакладна паведамляць уладам. Вэтэрынар можа застасаваць шчапеньне проці карбункулу. За жывёлу, якая падзе паміж 1 ым і 2 ім шчапеньнем, або найпазьней цераз 14 дзён пасьля 2-га шчапеньня, гаспадар атрымоўвае адшкадаваньне.

—ч.

Лекарскія зёлкі.

Ад найдаўнейшых часоў даходзяць да нас весткі, як розныя знахары, знахаркі, шаптуны ды наагул старыя людзі, асабліва жанчыны займаліся зьбіраньнем г. зв. памоцных зёлак і лячылі імі хворых.

У пазьнейшую пару навука забараніла верыць ў лячэньне знахараў, але-ж тая самая навука пераканалася аб вялікай лекарскай сіле шмат якіх зёлак і сягодня аптэкі прыгатаўляюць з іх рознаякія лякарствы.

Да апошніх часоў найбольшую колькасьць зёлак дастаўляла нам заграніца, дзе яны гадуюцца на адумысловых плянтацыях, крышацца (рэжуцца) на спэцыяльных машынах ды надзвычайна ўмела сушацца. У тойжа самы час, тыя-ж самыя зёлкі ў вялікай колькасьці расьлі ў нас і зьяўляліся нявыкарыстаным багацьцем краю.

У апошнія пасьляваенныя часы абставіны зьмяніліся. Цяпер у Польшчы сотні людзей займаюцца фахова зборам зёлак і існуюць арганізацыі і паасобныя людзі, якія высылаюць іх нават заграніцу вагановымі партыямі, па некалькі тысячаў кілёграмаў. Толькі ў нас, беларусоў ніякая зарганізаваная праца дагэтуль у гэтым напрамку не вялася. Праўда, шмат сялян, пераважна жанчын, зёлкі зьбірае, але прадаюць іх па крышцы, часта сьвежыя, ня сушаныя, розным дробным гандляром, а калі хто і прыгатовіць большую колькасьць высушаных зёлак, то ня ведае дзе іх прадаць і, зразумела, зьнеахвочываецца да распачатай працы.

Праца гэтая хоць у сваім пачатку і дробная, усё-ж такі карысная. Але аплатнасьць яе толькі тады будзе зусім пэўнаю, калі ўзяцца за яе умела. Вось дзеля гэтага Т-ва „Пчала“ ладзіць спэцыяльныя 3-тыднёвыя завочныя курсы. Курсы гэтыя усебакова пазнаёмяць зацікаўленых з працэсам збору і прыгатаўленьня лекарскіх зёлак, а Т-ва „Пчала“ запэўніць збыт іх, скупляючы і бяручы ў коміс кожную колькасьць. Не пашкодзіць заўважыць, што апрача карысьці матэрыяльнай, збор лекаркcіх зёлак мае і моральнае значэньне. Самы працэс зьбіраньня вымагае пэўнага паважнейшага напрамку думак, дае тэму да гутаркі, заахвочвае да працы дзеля падняцьця свайго дабрабыту, а найважнейшае, — прыбліжае чалавека да прыроды, знаёміць з яе цудамі і праз гэта ўплывае на этычнае і эстэтычнае разьвіцьцё чалавечай душы.

Дзеля вышэйсказанага збор лекарскіх зёлак зьяўляецца вельмі адпаведным і карысным заняткам для школаў і наагул дзіцячых групаў. Вясковыя вучыцялі ды наагул інтэлігенты павінны старацца арганізаваць цэлыя дзіцячыя кадры, зьбіраць з імі лекарскія зёлкі і акуратна рыхтаваць дзеля прадажы. Гэтакім чынам дзеці змогуць сабе зарабіць на кніжкі, а нават на цёплую адзежу, а ў душах дзіцячых зародзіцца пашана да тых твораў Божых, што хоць гаварыць і рухацца ня могуць, а столькі карысьці людзям прыносяць, пашана і любоў, якія не пазволяць дзяцём бязмысна таптаць і рваць кветкі, ды ламаць галінкі, як садовых, так і дзікіх лясных і прыдарожных дрэваў.

Л. В.

Як гаспадарыць малаком чэская гаспадыня.

„Zemed. Jednota“ № 7/34 орган фаховага саюзу чэскіх землябаў зьмяшчае апісаньне малочнай гаспадаркі аднэй сваей чытачкі, чэскай гаспадыні, адзначанае на конкурсе першай нагародай. Радаў з гэтага апісаньня сьціслa ўсюды застасовываць пэўна-ж ня можна, але агульныя правілы могуць быць карысны. а прынамся цікавы і для нас. Апісваная хвальварчная гаспадарка працуе відавочна ў мясцовасьці, дзе няма малачарскай коопэратывы. — р э д.

„Якасьць масла залежыць перадусім ад пашы дойных кароваў. Можна яе палепшыць прыдаваньнем мучной абсыпкі і такой самай пойлы. Старая чэская народная прыказка кажа: „Dej kravê do držky, ona ti dà do dižky“ (дай карове ў губу, яна табе дасьць у дайніцу). Але пры сёлетняй*) страшна нізкай цане малака і масла ня можна прыкармліваць; наадварот, па леташнім сухім і неўраджайным леце трэба ва ўсім пошары, акрамя саломы, быць ашчадным, трэба дзеля таго, з увагі на якасьць масла, запасы мучной абсыпкі і канюшыны дакладна падзяліць, каб хапіла іх на цэлую зіму, аж да пераходу на пашу зялёную.

Далей, якасьць масла залежа ад здароўя дойных кароваў. Каровы нездаровыя трэба з агульнага хлява аддзяліць, западозраныя — даіць заўсяды на астатку, а малако ад іх зліваць асобна; спатрабуецца яно з в а р а н а е ў гаспадарцы, або скорміцца (сьвіням). Таксама трэба добра памятаць рок (срок) цельнасьці кароваў. Малако ад кароваў высокацельных таксама не мяшаем і не даём на цэнтрыфугу разам з тым малаком, сьмятану з каторага хочам біць на масла.

Трэцім і найважнейшым пунктам, ад каторага залежа якасьць сельскага масла, ёсьць чыстата. Абсалютная чыстата заўсяды і ўсюды, дзе толькі малако датыкаецца да рукі, да начыньня, цэнтрыфугі, бойкі (масельніцы).

У сярэдніх і большых гаспадарках дояць наёмныя дзеўкі, у дробных — самі гаспадыні. Да даеньня няхай кожная мае рукі заўсяды чыста вымытыя, чысты хвартух, а галаву зьвязаную хусткай ці... чэпчыкам. І добра і хараша. Па выдаеньні кожнай каровы, перш чым сесьці пад другую, няхай старанна вымые рукі. ¿У часе... калі каровы церпяць на разваньненьне, маюць пад сабой шмат гною, аб каторы запэцкаюць вым'е: трэба яго прад даеньнем абмыць цёплай вадой. Нехта скажа мо', што гэта марудна, але па тыдню гэткай працы прывыкнуць да яго і работніцы і каровы і праца хутка робіцца. Дзеўка бярэ судзіну з вадой, мягкай сьціркай, добра прамочанай вадой, двума дотыкамі абмые вым'е, ідзе да другой — трэцяй каровы, пасьля йшчэ спалошча і вым'і чыстыя. Каровам гэта відавочна прыемна, а малако доенае з гэтак абмытых вым'яў бывае чыстым.

Даеньне мусіць ісьці скора, без непатрэбнага адцягіваньня і доўгага прабываньня ў хляве, дзеля таго што цёплае малако лёгка прымае ўсялякія запахі і пасьля дае няпрыемны смак. З гэтай прычыны трэба хлеў ветрыць, старанна выбіраць гной і дбаць, каб у хляве нічога ня гніло і ня тлела. Малако зьліваецца найлепш у вялікія збаны, усярэдзіне пацынаваныя, дзеля таго што іх найлепш і найбесьпячней перанасіць.

Аж дагэтуль парадак працы быў агульны, далей — паасобны. У маім выпадку паступаю далей гэтак: Дзеля таго што кормім двойчы ўдзень, таксама двойчы ўдзень і доім. Вячэрняе малако студзім у „малочным склепіку“, дзе маем студзёную цякучую ваду. Хто гэтай „жывой“ вады ня мае, можа зрабіць судзіну з бэтону, з дзюрой у дне на выпусканьне вады і гэту ваду зьмяняць прынамся двойчы ў тыдзень. Рана малако (вячэрняе) аграваецца на 35° Ц і разам з малаком ранішнім даецца на цэнтрыфугу. Цэнтрыфугу па кожным ужываньні т р э б а з а р а з - ж а старанна вымыць гарачай чыстай вадой... Трубкі і бубен шаруюцца шчоткай. Раз у тыдзень вымыем цэнтрыфугу ў вадзе, да каторай дадаецца крыха соды, а пасьля спаласківаецца вадой чыстай.

Сьмятану зьбіраю ў гаршкі паліваныя, да гэтага толькі празначаныя і н і к о л і не м я ш а ю. Гэта знача, калі зьбіваю масла раз у тыдзень, мушу мець 7 гаршкоў на сьмятану....“

(д. б.)

*) Напісана гэта ўвосені 1933 г.

Kooperatyŭnyja naviny.

N o v y k o o p e r a t y ŭ n y z a k o n z dnia 13 sakavika 1934 h. ab jakim my niekalki razoŭ pisali, užo apublikavany ŭ Nr. 38 „Dzien. Ustaw“ z dn. 9 traŭnia 1934 h. U nastupnym numary „Samapomačy“ padamo skaročany pierahlad, a pa mahčymašci pačniom drukavać i poŭny źmiest hetaha zakonu. — U źviazku z novym zakonam, ad 9 traŭnia Sudy nia majuć užo prava rejestravać kooperatyvy, da statutaŭ katorych nie dałučana zhoda Koop. Rady abo Koop. Sajuzu.

M i ž n a r o d n y K o o p e r a t y ŭ n y K a n h r e s (XIV) sklikajecca sioleta ŭ Anhliju, u Londyn, na čas ad 4 da 7 vieraśnia ŭklučna. Narady sioletniaha kanhresu buduć mieć vialikaje i važnaje zadańnie: znajšci sposab suproćstavicca varožym naskokam na kooperacyju z boku peŭnych kruhoŭ hramadzianstva i całych dziaržavaŭ.—Kanhres budzie adbyvacca ŭ viedamaj Kryštalovaj Pałacie. jakaja jość sapraŭdnaj cackaj budaŭlanaj techniki. Pałata

Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ

Bielaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 1—3.

heta zbudavana ŭ 1851-54 hadoch na londynskim pradmieści, u parku, jaki razam z stavami i vastravami zajmaje płošču 20 hektaraŭ. Pałata zbudavana z škła i žaleza, udoŭžki mieryć 117 metraŭ, ušyrki — 36 m. i ŭvyški — 53 m., a kaštavała jana 58 miljonaŭ zł. Na hetkija pałacy moža sabie pazvolić tolki Anhlija.

Kooperatyŭnaja Rada pry Ministerstvie Skarbu ŭ Varšavie adbyła anahdaj svajo pieršaje pasiedžańnie pa ŭvachodzie ŭ siłu novaha kooperatyŭnaha zakonu. Rada pastanaviła imknucca da chutčejšaha zlikvidavańnia i vykasavańnia z sudovych rejestraŭ kooperatyvaŭ biazčynnych, abo takich, jakija čynnaściu svajoj škodziać(?) intaresam kooperacyi. Dalej, Rada źmienšyła košty revizii kooperatyvaŭ h. zv. dzikich, ustanaŭlajučy apłatu za adzin dzień revizii na 45 zł. — razam z koštam prajezdu, zamiest dahetulašnich 200 zł. — z daličeńniem koštaŭ prajezdu. Należnaść pry hetym apłačvajecca biespasiaredna na rachunak fondu Kooperatyŭnaj Rady, z katoraha pašla apłačvajucca revidenty Rady. Apracavana taksama była instrukcyja dla kooperat. sajuzaŭ u spravie vydavańnia paśviedčańniaŭ, pazvalajučych załažyć novuju kooperatyvu. Urešcie pastanoŭlena było apracavać i vydać drukam špisańnie ŭsich kooperatyvaŭ na abšary Polščy, pavodle vajavodztvaŭ i pavietaŭ, z aznačeńniem dnia ichnaha załažeńnia, hrupy padatkavaj i prynaležnaści da kooperatyŭnaha Sajuzu. Dla kooperatyvaŭ kredytovych pastanoŭlena było vydavać trymiesiačnyja biuleteni z padańniem: stanu ŭkładaŭ na aščadnaści, pazyčak i h. d.

Biełaruski Nacyjanalny Kamitet u Vilni — usienarodnaje pradstaŭnictva Biełarusoŭ pad Polščaj — abnaviŭsia na 1934/35 hod i na ahulnym schodzie 23 traŭnia siol. h. pieravybraŭ novy prezydyjum u nastupnym składzie: staršynia — J. Paźniak, vice-staršyni: V. Bahdanovič i M. Mancevič, skarbnik — A. Klimovič i sekretar — Uł. Kazłoŭski.

U Kamitecie ličycca sioleta 27 pradstaŭnikoŭ ad roznych biel. arhanizacyj i instytucyj. Pradstaŭnikami redakcyi „Samapomačy" ŭ K-cie źjaŭlajucca hramadzianie: A. Klimovič i M. Mancevič.

Гаспадарчая хроніка.

Сэкцыя Эканомікі і Статыстыкі пры БІГіК ужо апрацавала Рэгулямін і цяпе апрацоўвае інструкцыі і плян працы на будучы год. Асобы, якія цікавяцца працай Сэкцыі і маглі-б у ёй працаваць, могуць ужо запісвацца ў памешканьні Інстытуту (Завальная 1—1), або ў рэд. „Самапомачы".

Помач галадаючым беларусом з ахвяры Літоўскага Дабрадзейнага Т-ва сарганізавана пры рэд. „Самапомачы". Заявы, пасьведчаныя ведамымі людзьмі і бел. ўстановамі прысылаць трэба не пазьней 3 чэрвеня сёл. г.

Ласосі ў Вяльлі. Дня 5 траўня сёл. ўпушчана было ў Вяльлю каля вёскі Ашкінцы каля 20.000 (двацаці тысяч) штук ласосевага нарыбку, выгадаванага на біолёгічнай рыбацкай станцыі ў Белай Вацы пад Вільняй.

Цэны на збожжа падымаюцца. Па доўгатрывалым сталы спаданьні цэнаў на збожжа, апошнім часам гэтыя-ж цэны пачалі падымацца, памалу але стала. Мясцовыя млыны робяць запасы збожжа і ахвотна купляюць яго, плацячы даражэй чым казённы ПЗПЗ.

Ратуйцеся самі ад шкоднікаў! З усіх бакоў даходзяць чуткі аб тым, што ў садох, у агародах і на палёх зьявілася шмат розных шкоднікаў. У сувязі з гэтым Stacja Ochrony Roślin (Wilno, Objazdowa 2) заклікае тых гаспадароў, у каторых шкоднікі зьявіліся, прысылаць ей самых шкоднікаў і пашкоджаныя расьціны, а таксама апісаць колькі шкоды гэтыя шкоднікі зрабілі (прыблізна) і гдзе (павет, гміна, мясцоваcьць). Станцыя будзе магчы паводле гэтага распазнаць шкодніка і падаць спосаб абароны.

Дадаць трэба, што на Станцыі Абароны працуюць спэцыялісты, дык іхная рада можа быць вельмі карысная.

Зьмена памешканьня Віленскай Збажжова-Таварнай Біржы прадбачыцца у хуткім ужо часе; будзе мясьціцца яна цяпер пры вул Конскай № 20.

Новая чыгунка ці лепш—чыгуначная ветка будуецца з дагэтуляшняй станцыі Друскенікі да Друскенікаў—курорту. Адлегласьць гэта роўная 18 кілёмэтрам. Работа пачатая 1 траўня і мае быць кончана 15 верасьня сёлета.

Вільня—Кабыльнікі — шаса, якая будуецца ўжо доўгі час, мае быць таксама сёлета скончана.

Наша пошта.

Жукоўскі — Б.: Праспэкт Завочнага Курсу Коопэрацыі Вам высланы; найлепш аднак запісацца на Курс з верасьня м-ца, толькі не пазьнецеся, бо лік мясцоў аграніčаны (вычэрпываюцца друкаваныя лекцыі Курсу).

Гурток БІГіК. — Будслаў: Рэклямаваныя нумары „Самапомачы" Вам высланы, атрымалі?

Матэлёнак Я.: Тымчасам не атрымалі ад Вас абяцанай падпіскі на „дзесятку" „Самапомачы" і таму пасылаем толькі тое што аплачана. З тым мамэнтам як аплаціце падпіску будзе Вам ўсё выслана.

Hapanionak: „Sceničnyja Tvory" Vam vysłany, piśmo — na pakazany adres — taksama. „Dziesiatku" „Samapomačy" budziem Vam vysyłać. Žadajem ŭdačy ŭ pracy.

М. С. — у В. Л. Прысланыя весткі так скупыя, што ня можна з іх мець выразьнейшага паняцьця аб стане рэчаў. Напішэце абшырней. Жадаем шчасьця ў працы!

Я Шатраўскі — С: Часопісь наша акуратна Вам высылаецца, гіне нейдзе ў дарозе. Рэклямаваныя нумары (ад № 1/34) высланы: атрымалі?

Я. Корбут — К.: Бесьпячней ужываць малака пераваранага, але няпрыпаленага. Адказ высланы пісьмом. Чакаем на падпіску.

Міранові̇ч, Аблажэй і Валканоўскі: падпіску атрымалі, часопісь высылаем. Пашырайце!

(Fraciah cenaŭ z 2 bač. vokładki):

Ryby 18.V.1934.

Ceny hurtovyja za kilo.

Karpy žyvyja, vialikija	1.80—2.20
„ niažyvyja	1.30—1.50
Ščupaki žyvyja, paleskija za kilo.	1.50—1.80
„ niažyvyja „	1.30—1.50
Płotki	0.35—0.40
Vuhoryč	1.80—3.00
Laščy	1.30—1.80

Pierasyłka apłačana ryčałtam.

CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ